# Як пазначыць свой кантэнт

1. **Абраць ліцэнзію CC можна з дапамогай Абірача** (Інструменту для выбару ліцэнзій на сайце Creative Commons (creativecommons.org/choose/?lang=be). Адкажыце на некалькі простых пытанняў – і атрымаеце назву і адпаведны HTML-код са спасылкай на падыходзячую вам ліцэнзію.

2. **Капіруйце і ўстаўляйце атрыманы HTML-код на вашу ўэб-старонку ці ўэб-сайт** (калі ў вас ёсць жаданне пазначыць усе матэрыялы вашага сайту пад адной ліцэнзіяй, то варта будзе ўставіць HTML-код у шаблон вашага сайту).

3. **Рэдагуйце тэкст апісання ліцэнзіі** (калі маеце ў гэтым патрэбу). Вы можаце выкарыстоўваць ліцэнзію як для ўсяго сайта, так і для канкрэтных матэрыялаў – гэта можна пазначыць рознымі спосабамі.

## Прыклады:

wiki.creativecommons.org/wiki/Marking_your_work_with_a_CC_license

Мы не рэкамендуем пазначаць ватэр-маркі (watermark) ці візуальныя маркеры на самім малюнку, паколькі гэта можа сказіць малюнак і перашкодзіць яго паўторнаму выкарыстанню. Лепей падпішыце малюнак, зазначыўшы ў подпісу неабходную інфармацыю.

# Асаблівасці атрыбуцыі

Адна з найбольш распаўсюджаных праблем - Аўтар не заўсёды правільна выкарыстоўвае Атрыбуцыю. Атрыбуцыя - гэта само пазначэнне аўтарства і ключавая кампанента ў ліцэнзіях Creative Commons.

**Усе з прапанаваных вышэй ліцэнзій дазваляюць Аўтару дадаць наступную інфармацыю:**

- [пажадана] ідэнтыфікацыя сабе як аўтара Матэрыяла (імя, псеўданім і інш.),'
- [не абавязкова] паведамленне пра ахову правоў (Напрыклад, "Некаторыя правы абароненыя"),
- [абавязкова] паведамленне аб тым, што твор знаходзіцца пад пэўнай ліцэнзіяй (наш выпадак - Creative Commons),
- [не абавязкова] паведамленне пра адмову ад гарантый,
- [пажадана] актыўная спасылка на арыгінал матэрыяла.

Усе асобы, якія плануюць выкарыстоўваць ваш матэрыял, будуць абавязаны пазначаць яго менавіта такім чынам, як вы вырашылі.

**Варта заўважыць!**
Калі вы не дадаеце ніякіх асаблівых звестак, якім чынам ваш матэрыял павінен узгадвацца, тады ў асобы, якая выкарыстоўвае матэрыял, будзе абавязак толькі пазначыць, што на матэрыял распаўсюджваецца пэўная ліцэнзія. У гэтай асобы не будзе абавязку пазначаць вашае імя і іншыя звесткі. Калі для вас прынцыпова, каб твор пазначаўся пэўным чынам, лепей дадайце такія звесткі.

Падобнае правіла дзейнічае і на мноства твораў. Напрыклад, вы адразу пазначаеце сайт, блог, або галерэю. У гэтым выпадку павінен быць адзін аўтар, або аўтары пагаждаюцца працаваць на адных умовах.

# Месца для ліцэнзіі

Існуюць шмат практык пазначэння твораў на сайтах. Усе яны адпавядаюць прынцыпам:

- **Прыкметнасць** - карыстальнік сайта можна лёгка знайсці пазначэнне.
- Зразумела **хто менавіта з'яўляецца аўтарам** і **на якіх умовах распаўсюджваецца** твор.
- Максімальна проста **можна прачытаць поўны тэкст умоваў**.

**Пазначэнне можа быць:**

- пад творам (схема, фота, відэа)
- у канцы матэрыяла (пад артыкулам)
- пазначана цытаваннем, як у курсавых або навуковых артыкулах, зноскі на канец, асабліва, калі праца рабілася намаганнямі шматлікіх аўтараў
- напачатку твора пад назвай (звычайна пазначаюць таго, хто напісаў тэкст, зрабіў фота, або відэа)
- дададзена як вэб-рэдакцыя ці/або воблакам джава скрыптоў - якое выконваюць функцыю "паказаць больш"
- прапісана ў палітыцы сайта - тут можна вызначыць палітыку як для ўсяго кантэнту, так і для асобных яго відаў [чытай буклет Крок 5], як на асобнай старонцы, так і ўнізе (падвале, футэры) сайта.